# 20 красавіка 2024 г. – 65 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Мікалаевіча Чыквіна (1959), народнага майстра Рэспублікі Беларусь, мастака, разьбяра па дрэве



Уладзімір Мікалаевіч Чыквін нарадзіўся 20 красавіка 1959 года ў г. Высокае Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Вучыўся ў Дзмітровіцкай сярэдняй школе. Пушчанская зямля з яе прыгожымі краявідамі, на якой прайшло дзяцінства Уладзіміра, не магла не крануць душу хлапчука-падлетка. Спачатку марыў стаць леснікам, паколькі быў закаханы ў беларускую прыроду, але выбраў усё ж рамяство разьбяра па дрэве.

Да дзявятага класа ўжо канчаткова вызначыўся, што будзе займацца разьбой па дрэве, і стаў сур’ёзна займацца гэтай справай. Аднавяскоўцы адразу прыкмецілі яго талент. Заахвочвалі занятак сына і бацькі, якія былі працавітымі людзьмі. Бацька быў майстрам на ўсе рукі, маці, педагог мясцовай школы, нядрэнна малявала. Дзед Пятро па матулінай лініі рабіў з дрэва бочкі, калаўроткі, ладна майстраваў санкі, лыжы. Таму не дзіўна, што Уладзімір паступова далучыўся да выяўленчай працы. Першымі настаўнікамі ў выяўленчым мастацтве і разьбе па дрэве, акрамя маці, былі У. Б. Качаноўскі – настаўнік літаратуры, разьбяр-аматар і А. І. Вінярскі – прафесійны майстар-разьбяр.

Сваю першую сур’ёзную работу Уладзімір зрабіў спецыяльна для раённай выставы народнай творчасці ў Камянцы. Гэта была фігура звычайнага сяляніна.

З 1976 года пачалася працоўная дзейнасць Уладзіміра Чыквіна. Спачатку быў лабарантам у філіяле Акадэміі навук БССР запаведніка «Белавежская пушча», рабіў каляровыя ілюстрацыі да навуковых прац. Працаваў у Мікалаеўскай васьмігадовай школе (выкладаў маляванне і разьбу па дрэве) і ў Дзмітровіцкай сярэдняй школе Камянецкага раёна.

Далей была служба ў радах Савецкай арміі ў Закарпацці. Знаёмства ў час службы з цікавымі, таленавітымі людзьмі, якія

займаліся разьбярствам, яшчэ больш умацавала жаданне юнака прысвяціць сябе мастацтву. Нават да сённяшніх дзён не страціў Уладзімір Мікалаевіч цесных сувязяў з былымі саслужыўцамі – мастакамі-рэзчыкамі з Івана-Франкоўска.

Пасля вяртання на радзіму, пачаў працаваў у мастацкай майстэрні Камянецкага Дома культуры і адначасова рашае ўвасобіць сваю мару – паступіць на мастацка-графічнае аддзяленне Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. У працэсе навучання высветлілася, што Уладзімір не толькі добра выконвае практыкаванні з дрэвам, але і ўпэўнена, з асобым каларытам малюе. Вучоба ў інстытуце (1980-1984) дапамагла не толькі ўдасканаліць творчыя здольнасці, але і паглыбіцца ў вывучэнне беларускай культуры, звярнуць увагу на праблемы адыходу ў нябыт некаторых традыцыйных для нашых продкаў відаў мастацтва.

З 1983 года У. М. Чыквін жыве ў Кобрыне. Кобрынская зямля для Уладзіміра Мікалаевіча стала роднай і блізкай амаль адразу ж пасля таго, як упершыню апынуўся тут. Адкрыццё Кобрынскага вучылішча народных мастацкіх промыслаў № 156 супала з заканчэннем вучобы ў інстытуце, таму прапанову перадаваць свае веды і майстэрскія навыкі маладому пакаленню прыняў адразу. Спачатку прыехаў сам, а праз год перавёз і сям’ю на Кобрыншчыну.

Потым была праца мастаком-афарміцелем у мастацкай майстэрні Кобрынскага парку культуры і адпачынку імя А. В. Суворова. Прысвоена кваліфікацыя мастака першай катэгорыі. З 1986 года – кіраўнік гуртка разьбы па дрэве пры Доме творчасці юных. Абсталяваў мастацка-вытворчую майстэрню, стаў адным з заснавальнікаў гарадской мастацкай галерэі «Bona Sforca».

Плён стваральнай працы Уладзіміра Мікалаевіча можна ўбачыць у розных куточках Беларусі і далёка за яе межамі. Цікавай практыкай стала для майстра аднаўленне іканастаса ў Свята-Пакроўскім храме ў вёсцы Пачапава пад Баранавічамі і ў Пакроўскім храме ў вёсцы Чамяры Камянецкага раёна. Прымаў удзел у рэканструкцыі і аднаўленні згубленых элементаў у касцёлах у польскіх гарадах Беластоку і Кракаве. Стажыраваўся ў польскім Кракаве па аднаўленні палаца шлюбу палацавага комплексу князёў Браніцкіх, што ў Беластоку, у якасці разьбяра-рэстаўратара. Адна з турыстычных баз у Кыргызстане амаль цалкам аздоблена па эскізным праекце нашага земляка, а 25 драўляных домікаў,

выкананых ім з былымі калегамі, удзельнікамі кааператыўнай майстэрні, доўгі час упрыгожвалі цэнтральную плошчу г. Хромтаў у Казахстане. Вавёрка-каралева, якая пасялілася ў кобрынскім парку і палюбілася дзетвары, таксама справа рук Уладзіміра Чыквіна.

Ён часты госць мастацкіх фестываляў, праектаў, удзельнік этнаграфічных экспедыцый, лектар. Важную частку ў дзейнасці Уладзіміра Чыквіна займае ўдзел у выставах. Усяго за яго кар'еру было вялікае мноства выстаў - не толькі раённых, абласных, рэспубліканскіх, але і міжнародных. Удзельнік «Горада майстроў» на Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базару Віцебску». Удзельнік і дыпламант шматлікіх конкурсаў, выставаў, плэнэраў у Польшчы, Швецыі, Венесуэле, Індыі, Шры-Ланке. Аўтар праекта «Берасцейская лыжка», а таксама беларуска-шведскай ідэі «Зрабі фігуру», праграмы «Разьба па дрэве».

Член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці (2005), з 2005 года узначальвае абласное аддзяленне гэтага саюза. Член абласнога савета па традыцыйным мастацтве. Займаецца навукова-даследчай працай у кірунку «Беларускі драўляны посуд», напісаў метадычную працу «Берасцейская драўляная лыжка». Аўтар артыкулаў па мастацтве і культуры.

Уладзіміру Мікалаевічу Чыквіну прысвоена званне «народны майстар Рэспублікі Беларусь» (2010). З'яўляецца членам грамадскага аб'яднання абласнога тыпу аматараў мастацтваў рэгіёна «Белавежская пушча» і Брэстчыны «Тур», якое праводзіць вялікую работу па адраджэнні страчанага, захаванні духоўнай спадчыны. Выдатны майстар-разьбяр, у руках якога звычайны кавалак дрэва здольны ператварыцца ў казачнага персанажа ці пераўвасобіцца ў носьбіта нацыянальных традыцый; чалавек, які паставіў мэтай свайго жыцця адраджэнне народных промыслаў, якія аказаліся незаслужана забытымі.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Чыквін Уладзімір Міхайлавіч** // Памяць. Камянецкі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 1997. – С. 512-513.

**Кірылюк, Л. М**. Кобрынскія мастакі на мяжы стагоддзяў.Чыквін Уладзімір Міхайлавіч / Л. М. Кірылюк, Т. С. Назарук, Л. С. Шчур // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 526.

**Валасюк, Л.** Уладзімір Чыквін / Лявон Валасюк // Непрыдуманыя партрэты / Лявон Валасюк. - Брэст, 2014. – С. 236-237 : фат.

**Бакун, А**. Дзе ёсць падмурак, там будзе і дах / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. — 2018. - 25 красавіка. - С. 6.

Забытыя рамёствы імкнецца адрадзіць У. Чыквін.

**Быцько, Л.** Стыпендыя для чарадзея / [Ларыса Быцько ; гутарыў] Яўген Рагін // Культура. - 2018. — 14 ліпеня. — С. 11

Разбяр У. Чыквін адаптуе старадаўнюю традыцыю беларускай «рэзі» да сучасных умоў.

**Волков, С.** Искусство в дереве / Сергей Волков // Заря. - 2018. — 22 августа. — С. 2.

Резчик по дереву В. Чиквин принимает участие в областном пленере резчиков монументальной скульптуры.

**Крывецкая, Н**. Знакамітасці ў дрэве / Наталля Крывецкая // Заря. - 2018. — 1 сентября. — С. 6.

Майстар-разбяр У. Чыквін прымаў удзел у абласным пленэре разьбяроў манументальнай скульптуры.

**Мечная, Н**. Трагедия Сороцней / Наталья Мечная // Заря. - 2018. — 22 сентября. — С. 5.

Резчик по дереву В. Чиквин — один из авторов скульптурной композиции, установленой в д. Сороцни Дрогичинского района в память о трагических событиях 15 сентября 1943 г.

**Сацута, А.** Майстравіты «Скарб» / Алена Сацута // Заря. - 2017. — 16 сакавіка. — С. 12.

Калекцыя драўлянага посуду кобрынскага майстра У. Чыквіна была прадстаўлена на выставе «Вандорўкі па Палессі» ў Польшчы.

**Кандрашук, Н.** Ён разумее дрэва / Наталля Кандрашук // Кобрынскі веснік. - 2015. — 24 кастрычніка. — С. 4.

Майстар-клас па разьбярстве ад народнага майстра Рэспублікі Беларусь У. Чыквіна з г. Кобрына.

**Волосюк, Л.** Портреты - встречи. Народные мастера. Узнаваемые личности / Лявон Волосюк ; подготовила Н. Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. — 23 октября. — С. 3.

**Чыквін, У.** Пуцёўка ў вечнае лета / [Уладзімір Чыквін ; гутарыў] Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. — 2014. - 15 лютага. - С. 10.

У. Чыквін прадстаўляў народныя рамёствы і промыслы на Міжнародным фестывалі «Расія - Індыя - Шры-Ланка».

**Генюш, М.** Убачыць анёлаў : [аб выставе клуба майстроў народнай творчасці Берасцейшчыны «Скарб» у Брэсцкім АГКЦ, аўтарскія калекцыі У. Чыквіна, В. Логвіна, М Кулецкай; фота] / Марыя Генюш // Брестский вестник. — 2013. — 16 мая (№ 20). — С. 19.

**Мельнік, Р.** Фігуры роду Сапегаў - у падарунак / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2013. — 19 чэрвеня. — С. 3.

Актыўны ўдзел у абласным пленэры разьбяроў манументальнай скульптуры прыняў кобрынскі народны майстар Уладзімір Чыквін.

**Бунеева, Л.** «Лучший сувенир»: успехи и подмоченные репутации / Людмила Бунеева // Вечерний Брест. - 2011. - 1 апреля. - С. 4.

Среди победителей конкурса «Лучший сувенир» - кобринчанин В. Чиквин (шкатулка, поднос, панно, выполненные в технике резьбы по дереву).

**Кандрашук, Н.** Сустракаліся майстры народнага мастацтва / Наталля Кандрашук // Кобрынскі веснік. - 2011. - 15 кастрычніка. - С. 12.

Кобрынскія рамеснікі У. Чыквін і В. Дароцька прымалі ўдзел у беларуска-шведскім семінары разьбяроў.

**Мошчык, С**. «Скарб» Берасцейшчыны / Сяргей Мошчык // Вечерний Брест. - 2011. - 9 декабря. - С. 6.

Аб абласным клубе майстроў народнай творчасці, членам якога з’яўляецца У. Чыквін.

**Кандрашук, Н.** Белавежскія карані разьбяра / Наталля Кандрашук // Літаратура і мастацтва. - 2010. - 14 мая (№ 19). - С. 12.

**Мельнік, Р.** Майстар. Аднойчы і пажыццёва : народны майстар У. Чыквин / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2010. - 17 красавіка. - С. 1.

**Народный** мастер Чиквин // Кобрин-информ. - 2010. - 15 апреля. - С. 2.

Кобринскому художнику, скульптору, мастеру по дереву В. Чиквину присвоено звание народного мастера Республики Беларусь.

**Кобринский** мастер оценивает шведских мастеров // Кобрин-информ. - 2009. - 17 сентября. - С. 28.

В. Чиквин – член Белорусского союза мастеров народного творчества Республики Беларусь.

**Мельнік, Р.** Чыквін, У.: «А творчае жыццё ўсё ў плённай працы» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2009. - 22 ліпеня. - С. 6.

**Пазнаёміліся** з Венесуэлай // Народная трыбуна. - 2008. - 5 студзеня. - С. 3.

На працягу 10 дзён у складзе прадстаўнічай дэлегацыі кобрынскія майстры народнай творчасці Ю. Піваварава і У. Чыквін знаёмілі жыхароў Венесуэлы з дасягненнямі беларускай культуры.

**Чыквін, У.** Стваральнік вечнай прыгажосці / Уладзімір Чыквін ; [гутарыла] Вікторыя Патоня // Кобрынскі веснік. - 2008. - 23 красавіка. - С. 4.

**Наши** в Венесуэле // Кобрин-информ. - 2007. - 13 декабря. - С. 2.

**Патоня, В**. Падарунак лёсу / Вікторыя Патоня // Кобрынскі веснік. - 2007. - 29 снежня. – С. 1,2.

Майстрам народнай творчасці Ю. Піваваравай і У. Чыквіну пашчасціла пабываць у Венесуэле.

**Шевченко, А**. В творческой мастерской Владимира Чиквина / А. Шевченко // Кобрин-информ. – 2006. – 3 августа. – С. 5.

**Глущенко, Т.** Древо на всю жизнь / Т. Глущенко // Вечерний Брест. – 2005. – 17 августа (№ 65). – С. 6.

О кобринском резчике по дереву В. Чиквине.

**Свинтилова, Н.** В «Городе мастеров» поселились брестчане / Наталья Свинтилова, Татьяна Корнелюк // Вечерний Брест. – 2005. – 20 июля. – С. 8.

Кобринский резчик по дереву В. Чиквин на «Славянском базаре».

**Хильчук, М.** Рук мастерство и дерева тепло / М. Хильчук // Кобрынскі веснік. – 2005. - 21 верасня. – С. 3.

**Чыквін, У.** З Віцебска – з перамогай / Уладзімір Чыквін // Кобрынскі веснік. – 2005. – 30 ліпеня. – С. 3.

Разьбяр У. Чыквін атрымаў 1 месца ў намінацыі «Выраб утылітарнага прызначэння».

**Данилова, Е**. Не только состояние души / Елена Данилова // Кобрин-информ. – 2004. – 18 марта. – С. 3.

О выставке работ В. Чиквина.

**Трибулева, Е.** Соло для деревянной ложки / Елена Трибулева // Вечерний Брест. - 2004. - 28 января. - С. 2.

О коллекции резчика по дереву В. Чиквина.

**Шульга, Т.** Взметнулись в небо три креста / Татьяна Шульга // Заря. - 2004. - 14 декабря.

О крестах, установленных резчиками по дереву А. Турковым, В. Доротько и В. Чиквиным в д. Млыны Каменецкого района.

**Микрюков, А.** Пасхальный вернисаж в общественно-культурном центре / Александр Микрюков // Брестский курьер. - 2003. - № 18. - С. 8.

О выставке работ В. Чиквина (Кобрин) и А. Туркова (Каменец) в Бресте.

**Удивят** многогранностью таланта // Заря. – 2002. – 26 апреля. – С. 1.

28 апреля в общественно-культурном центре откроется выставка работ известных художников Брестчины, в их числе В. Чиквин.

Кобрынскі раён
Кобрын
Камянецкі раён
Высокае
Чыквін Уладзімір Мікалаевіч
Народныя майстры
Мастакі
Разьбяры па дрэве